Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-12-28

# Свяці, «Полымя»!

Старэйшы літаратурна-мастацкі часопіс краіны адзначыў свой 90-гадовы юбілей. Урачыстая вечарына прайшла ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

**Даніла АРЦІМОВІЧ,**
**фота Кастуся Дробава**



Імпрэза пачалася з віншавання Прэзідэнта Беларусі, якое зачытаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў. Паводле Кіраўніка дзяржавы, «Полымя» прайшло «заўважны гістарычны шлях і адлюстравала значны перыяд жыцця нашага народа. На старонках часопіса друкаваліся творы класікаў, пісьменнікаў даваеннага і пасляваеннага пакаленняў, якія прынеслі беларускай літаратуры прызнанне ў свеце».

Аляксандр Міхайлавіч павіншаваў калектыў і асабіста. Ён узгадаў, што ў савецкія часы выданне імкнулася падтрымліваць перш за ўсё айчынных майстроў слова. На яго думку, цяпер, у незалежнай Беларусі, варта пашыраць абсягі і прадастаўляць трыбуну творцам з іншых краін. А. Радзькоў пажадаў палымянскаму калектыву працягваць творчыя пошукі і з упэўненасцю канстатаваў: «Вы патрэбныя краіне!»

Намеснік міністра інфармацыі Беларусі Уладзімір Матусевіч адзначыў, што ў савецкія часы публікацыя ў часопісе была мэтай кожнага айчыннага літаратара, і пажадаў працягваць традыцыю. Ён уручыў дзве падзякі міністра: адну — усяму калектыву «Полымя», а другую — асабіста загадчыку аддзела прозы Уладзіміру Саламаху.

Дырэктар—галоўны рэдактар выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч ахарактарызаваў часопіс як «інтэрнацыяналіста», што знаёміць чытачоў з літаратурай народаў свету, асабліва постсавецкай прасторы. Алесь Мікалаевіч уручыў дыпломы «Полымя» аўтарам найбольш цікавых публікацый, што сёлета з'явіліся на старонках часопіса. У сваю чаргу юбілейныя медалі Саюза пісьменнікаў Беларусі ад першага сакратара гэтай арганізацыі Генадзя Пашкова атрымала група айчынных творцаў.

Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Каваленя адзначыў плённае супрацоўніцтва «Полымя» і НАН. Так, «круглыя сталы», якія ладзіліся дзвюма арганізацыямі, даўно сталі не святам, а штодзённай працай. Аляксандр Аляксандравіч уручыў ганаровую грамату прэзідыума Нацыяльнай акадэміі навук пісьменніку Алесю Марціновічу.

Акадэмік НАН Беларусі Уладзімір Гніламёдаў звярнуў увагу, што з шэрагу літаратурных часопісаў, якія былі заснаваныя ў Савецкім Саюзе ў 1920-я гады, дагэтуль выходзяць толькі «Полымя» і «Сибирские огни». На яго думку, 90 гадоў — сведчанне мастацкай традыцыі, вопыту і далучанасці да гісторыі. «Полымя» заўжды будзе свяціць айчыннай літаратуры!